ясно, что могла бы быть создана школа белорусской росписи, если бы была поддержка со стороны Министерства культуры и Министерства образования республики. Достоинства белорусской росписи заложены в ее технологиях, графике рисунка узора, мажорном цветовом завершении. Только на первый взгляд роспись кажется простой, наивной, незатейливой. Необходимо обладать колористическим даром, что сравнимо с музыкальным слухом, и постараться развить этот дар в процессе постижения тайн мастерства. Нам оставлено такое наследство, с которым можно бесконечно разнообразно и вдохновенно работать. Мы с уверенностью можем говорить не только о своеобразной орнаментальной системе, графической завершенности, образной структуре, но и о широких технологических возможностях росписи. Поскольку молодые люди с удовольствием осваивают роспись как таковую, необходимо соединить усилия всех образовательных учреждений Беларуси, ученых, специалистов. Школа росписи в Беларуси должна стать значительным явлением в истории.

А.Ф.Раманоўскі,
*старшыня Івянецкага рэгіянальнага аддзялення Беларускага саюза майстроў народнай творчасці*

## РЭТРАСПЕКЦЫЯ Ў КАНТЭКСЦЕ АДРАДЖЭННЯ І РАЗВІЦЦЯ ТРАДЫЦЫЙ ІВЯНЕЦКАЙ ШКОЛЫ НАРОДНАГА МАСТАЦТВА

Івянец мае багатую, больш чым шасцісотгадовую гісторыю як адзін з найбольш развітых цэнтраў народнага мастацтва Беларусі. Мястэчка размешчана амаль на сумежжы двух гісторыка-энтаграфічных рэгіёнаў — Цэнтральнага (Цэнтральная Беларусь) і Паўночна-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Заходняга (Панямонне). Этнакультурны комплекс на пагранiччы суседнiх рэгiёнаў мае пераходныя рысы i акумулюе лепшыя здабыткi гэтых рэгiёнаў. Гiстарычна вакол Iвянца склаўся спецыфiчны лакальны рэгiён з адметнымi народнымi традыцыямi мастацкай апрацоўкi дрэва i металу, керамiкi, ткацтва. Першыя пiсьмовыя звесткi аб iвянецкiх майстрах адносяцца да XVI ст., але, бясспрэчна, што рамёствы тут iснавалi з пачатку ўзнiкнення паселiшча. Iвянец у сiвой мiнуўшчыне знаходзiўся на стратэгiчным шляху з Мiнска ў Вiльню, праз Налiбоцкую пушчу праходзiў гасцiнец на Навагрудак. Такое геапалiтычнае становiшча, багатыя залежы глiны i руды, лясныя рэсурсы станоўча спрыялi развiццю рамёстваў, народных промыслаў, гандлю.

У XVI—XVIII стст. у Iвянцы дзейнiчалi майстэрнi кавалёў, ткачоў, ганчароў, чаканшчыкаў, разьбяроў па дрэве, чырвонадрэўшчыкаў, бондараў. Рамеснiкам былi вядомы такiя тэхнiчныя прыёмы апрацоўкi металу, як лiццё з раздымнай формы. У гэтыя часы адбыўся працэс фармiравання самабытных народных iвянецкiх рамесных школ.

Еўрапейскую вядомасць у XVIII—XIX стст. набыло налiбоцкае шкло. Вырабы з хрусталю, каляровага i бясколернага шкла Налiбоцкай шкляной мануфактуры, утворанай у 1717 г. князямi Радзiвiламi на базе мясцовай гуты, вылучалiся высокiмi мастацкiмi якасцямi, дзякуючы спадчынным традыцыям.

У канцы XIX — пачатку XX ст. Iвянец набывае славу сталiцы ганчарства ў Беларусi. Паводле статыстычнага даведнiка "Волости и селения Европейской части России" (СПб., 1886) у Iвянцы дзейнiчалi 17 ганчарных майстэрняў, дзе выраблялi кафлю, бытавы посуд, ляпную дэкаратыўную пластыку, глiняныя цацкi-свiстулькi. Арцелi iвянецкiх муляроў, дойлiдаў, ганчароў, кафляроў працавалi ў розных кутках Беларусi. Вырабы iвянецкiх майстроў карысталiся вялiкiм попытам на кiрмашах многiх гарадоў i мястэчак Беларусi, нават Лiтвы i Польшчы. Да гэтага



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

часу склаўся ярка выражаны Івянецкі рэгіён народнага мастацтва, які ахопліваў тэрыторыю ад Ракава да Рубяжэвічаў, ад Волмы да Пяршая, а таксама вялікую частку Налібоцкай пушчы, дзе працавалі рамеснікі — выхадцы з Івянца. Уплыў івянецкіх традыцый быў пашыраны амаль на ўсю паўночна-заходнюю Беларусь, што было выклікана міграцыяй майстроў з Івянца з-за жорсткай канкурэнцыі ў цэнтры. Вядома, што выхадцы з Івянца заснавалі свае ганчарні ў Ракаве, Радашковічах, Даўгінаве, Паставах, Рудзішках, Рагозішках, Крэве, Красным і інш.

Каб стаць майстрам, а толькі гэта званне давала магчымасць і права на адкрыццё ўласнай ганчаркі, трэба было прайсці стадыю вучнёўства (ад 3 да 5 гадоў), потым наняцца чаляднікам да гаспадара, і толькі ва ўзросце 21 года вытрымаць іспыты на майстра — выканаць пробную работу (штуку). Вучыцца ў Івянец прыязджалі з розных куткоў Беларусі. Многія івянчане шліфавалі сваё майстэрства ў Мінску і Вільні.

Івянецкая кераміка вылучалася высокай тэхналогіяй вытворчасці. Майстры валодалі сакрэтамі прыгатавання палівы (глазуры), дасканалай тэхнікай фармоўкі, адліўкі, штампоўкі, дэкаратыўнай лепкі. Асартымент вырабаў быў вельмі разнастайны — ад звычайнага бытавога посуду, кафлі, цацкі-свістулькі да дэкаратыўнай керамікі (попельніцы, букетніцы, ляпных фігурных сасудаў). Адметнай рысай івянецкай керамікі было тое, што тут побач з ганчарствам існавала самабытная школа ляпной дэкаратыўнай пластыкі. Вырабы майстроў вылучаліся арыгінальнасцю, высокім густам і няўрымслівасцю творчай фантазіі. Гэтыя творы вельмі высока цаніліся і збываліся далёка за межамі рэгіёна, таму іх амаль не захавалася ў Івянцы.

Ганчарства, ткацтва, кавальства, разьбярства, бондарства, мастацкая апрацоўка металу, народнае дойлідства і іншыя віды народных промыслаў заўсёды суіснавалі тут і аказвалі ўплыў на развіццё ўласна івянецкіх традыцый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вядома, што традыцыі ляпной глінянай пластыкі ў сваёй творчасці шырока выкарыстоўваў разьбяр па дрэве Вітольд Паплаўскі. Не пазбег гэтых уплываў і знакаміты Апалінар Пупко, які часта браў у рукі гліну для здзяйснення сваіх задум. Элементы ўзораў ткацтва можна сустрэць на аздабленні керамічных і кавальскіх вырабаў. А сучасная фляндроўка, якая стала пашыраным элементам аздаблення ганчарнага посуду, бярэ свой пачатак ад размалёўкі сталярнай мэблі, дзе майстры імкнуліся дамагчыся імітацыі тэкстуры дрэва, выкарыстоўваючы прыём нанясення хвалепадобных рысак па свежазагрунтаванай паверхні вырабу. Калі хвалістымі лініямі рознакаляровай палівы ўпрыгожвалі посуд у 20-х гадах XX ст., то аднакаляровая стужка ангобы з фляндрам па сырым чарапку сустракаецца на ганчарных вырабах пачатку 30-х гадоў. Тэхніка спалучэння дзвюх і нават трох стужак рознага колеру ангобаў з хвалепадобнымі рысамі была распрацавана Вітольдам Кулікоўскім у пачатку 50-х гадоў.

У гістарычным працэсе сваёй эвалюцыі кожны з відаў народнага мастацтва ў розныя часы прайшоў этапы развіцця, росквіту, заняпаду і нават знікнення. Напрыклад, гвалтоўная ліквідацыя уніі ў Беларусі ў першай палове XIX ст. прывяла да заняпаду ў Івянцы культавай драўлянай пластыкі. Майстрам-разьбярам давялося не толькі мяняць сваю веру — пераходзіць у каталіцызм або ў праваслаўе, але і выракацца традыцый аб'ёмнай паліхромнай скульптуры. А ваяўнічы бальшавіцкі атэізм ушчэнт ліквідаваў рэшткі школы. Уніяцкія, каталіцкія і праваслаўныя творы культавага прызначэння згарэлі. Пасляваенны час быў вельмі неспрыяльны для існавання і развіцця народных промыслаў. Навукова-тэхнічны прагрэс і урбанізацыя выклікалі негатыўныя працэсы, якія вымусілі адных патомных майстроў назаўсёды развітацца са сваім рамяством, другіх — эмігрыраваць у Польшчу. Прымусовае аб'яднанне майстроў у арцель, а затым у прамкааперацыю таксама дало адмоўныя вынікі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Парушыўся патрыярхальны ўклад жыцця рамеснікаў, паступова пачалі страчвацца адвечныя народныя традыцыі. Спынілася вытворчасць рэльефнай паліванай кафлі, згубіліся традыцыі фігурнай ляпной пластыкі і гліпянай цацкі-свістулькі. З паўтара дзесяткаў кузняў, якія дзейнічалі ў Івянцы ў першай палове XX ст., не засталося ні адной. Пасля смерці Апалінара Пупко традыцыйнае разьбярства знаходзіцца пад пагрозай знікнення. Ткацтва паступова прыходзіць у заняпад. Ганчары сярэдняга і малодшага пакалення, выконваючы вытворчыя планы на заводзе мастацкай керамікі, не толькі страцілі пачуццё традыцыйнай народнай формы, але і элементарныя навыкі і прыёмы лепкі.

У пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя ў Івянцы пачаўся працэс адраджэння народных рамёстваў. Пры Івянецкай сярэдняй школе ў народнай студыі выяўленчага мастацтва дзеці сталі навучацца асновам ганчарства, дэкаратыўнай лепкі, разьбы па дрэве. На базе студыі былі адроджаны традыцыі івянецкай глінянай цацкі-свістулькі, сабрана першая рэтраспектыўная калекцыя твораў мясцовых майстроў. Многія выхаванцы студыі пасля заканчэння спецыяльных мастацкіх навучальных устаноў сталі прафесійнымі жывапісцамі, графікамі, мастакамі-мадэльерамі, скульптурамі, архітэктарамі, разьбярамі па дрэве. Але галоўным вынікам работы студыі стала тое, што былыя навучэнцы папоўнілі ганчарны цэх і творчую групу Івянецкага завода мастацкай керамікі.

З 1992 г. абласны музей узяў курс на захаванне народнай спадчыны. Пачаліся збор твораў народных майстроў, іх вывучэнне і сістэматызацыя. У 1995 г. супрацоўнікамі музея была распрацавана доўгатэрміновая мэтавая праграма "Вяртанне да вытокаў" па стварэнні Цэнтра рамёстваў з майстэрнямі ткацтва, керамікі, разьбы па дрэве і музейнага аб'екта "Кузня".

Івянецкія майстры пасля працяглага перапынку прынялі ўдзел у шэрагу нацыянальных выставак народнай творчасці, рэспубліканскім свяце "Ганчарны круг" у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бачэйкаве і абласным свяце “Гліняны звон” у Любані. У 1998 г. на базе Цэнтра рамёстваў было праведзена другое абласное свята ганчароў “Гліняны звон”.

Зараз пры Цэнтры рамёстваў дзейнічаюць майстэрні керамікі і ткацтва, на грамадскіх пачатках працуе школа рамёстваў. Тут захоўваюцца, вывучаюцца і развіваюцца традыцыі народнага мастацтва, адраджаюцца забытыя рытуалы і абрады рамеснікаў. Навучальны працэс набліжаны да натуральнага цэхавага спасціжэння асноў рамяства праз класічны трохвугольнік: вучань-чаляднік-майстар. Традыцыйнымі становяцца конкурсы майстроў, прысвечаныя слынным мясцовым майстрам, якія пакінулі яркі след у рэчышчы развіцця івянецкай школы народнага мастацтва, святы рамёстваў. Дзейнічае Івянецкае рэгіянальнае аддзяленне Беларускага саюза майстроў народнай творчасці.

Музей набывае рысы асяродка культуры, які сінтэзуе культуралагічную, тэарэтычную, выставачную і фондавую работу з практычнай дзейнасцю ў майстэрнях-лабараторыях Цэнтра рамёстваў праз навучальна-выхаваўчую функцыю на аснове народнай педагогікі і дасягненняў сучаснай педагагічнай думкі.

У аснову метадалогіі адраджэння і развіцця народных традыцый закладзена стрыжнёвая ідэя — да новага праз добра забытае старое. Рэтраспекцыя ў кантэксце адраджэння і развіцця традыцый івянецкай школы народнага мастацтва становіцца актуальнай і першаснай на дадзеным этапе.

К.А.Цітоў,
*студэнт*

## РЫНКА ЯК ВІД ТРАДЫЦЫЙНАГА ПОСУДУ БЕЛАРУСАЎ

Беларусь багатая глінай — асноўнай сыравінай для ганчарнай вытворчасці. Гэта і абумовіла ўзнікненне ганчарства на яе тэрыторыі з даўніх часоў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ